*Канец XX – пачатак XXI стагоддзя адзначаны бурным усплёскам этнанацыянальных працэсаў, якія ахапілі ўсе бакі жыццядзейнасці грамадства і вывелі праблемы этнасу ў шэраг глабальных праблем планеты. Школа не можа знаходзіцца ўбаку ад гэтых працэсаў, а абавязана глыбока і ўсебакова вывучаць праблемы этнакультурнага развіцця і арганізоўваць выхаванне моладзі ў адпаведнасці са зменамі не толькі сацыяльна-эканамічных умоў, але і з улікам спецыфічнасці ладу жыцця, форм культуры і побыту, народных звычаяў і традыцый, нацыянальнага характару і г. д. У педагагічнай скарбонцы сённяшніх школ ёсць нямала распрацовак і метадычных рэкамендацый аб праведзенні асобных мерапрыемстваў, укараненні ў вучэбна-выхаваўчы працэс элементаў нацыянальнай культуры. Адзначаючы відавочную недастатковасць распрацовак для арганізацыі поўнамаштабнай практычнай этнакультурнанасычанай дзейнасці школ рэспублікі, аўтар звяртае ўвагу на выніку навукова-педагагічных даследаванняў у галіне вызначэння сутнасці, зместу і асноўных шляхоў ажыццяўлення этнакультурнага выхавання школьнікаў і прыходзіць да вываду аб неабходнасці вызначэння агульных падыходаў да фарміравання этнакультурнай скіраванасці асобы як асновы інтэграцыі ў сусветную культуру.*



# МАДЭЛЬ ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ

## Мэты, задачы, змест, прынцыпы і формы



**В. С. Болбас,**
дацэнт Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя І. П. Шамякіна, кандыдат педагагічных навук

Адукацыя як ніякая іншая галіна валодае магчымасцю паспяхова сінтэзаваць этнанацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці, таму ў першую чаргу яна павінна працаваць на адзінства, цэласнасць і раўнавагу ў чалавечым грамадстве. Сапраўдная адукацыя не замыкаецца на простым навучанні, а вырашае задачу фарміравання асобы ва ўсёй яе шматмернай паўнаце інтэлектуальнасці і этнакультурнага развіцця, таму ёй заслужана адводзіцца вядучая роля ў гарманізацыі асабістых, нацыянальных і агульначалавечых інтэрасаў і каштоўнасцей.

**Фарміраванне этнічнай культуры асобы не толькі не адмаўляе, а, наадварот, дапускае і нават прадугледжвае далучэнне да агульначалавечых дасягненняў сусветнай культуры.** Структура асобы прадстаўніка сучаснай этнакультурнай традыцыі павінна ўключаць агульнаграмадзянскую і этнічную ідэнтычнасць, міжкультурную кампетэнтнасць. З аднаго боку, глыбокае вывучэнне агульначалавечай культуры дапамагае кожнаму асэнсоўваць і лепш разумець асаблівасці культурнай спадчыны свайго народа, стымулюе развіццё этнічнай свядомасці і шматгранную этнічную дзейнасць. З іншага боку, інтэграцыя ў сусветную культуру, разуменне вяршынь дасягненняў чалавецтва магчымы толькі пасля авалодання культурнай спадчынай свайго этнасу. Універсальная агульначалавечая місія адукацыі не можа і не павінна ўступаць у супярэчнасць з яе этнакультурнай функцыяй. Думка аб роўнасці ўсіх культур і субкультур і іх уздзеянні на чалавека, што мае месца ў рамках полікультурнага выхавання, прыводзіць да этнанацыянальнай маргінальнасці, у выніку якой чалавек не засвойвае ніводнай культуры, не прытрымліваецца вызначаных каштоўнасных арыентацый.

Патрабаванні да арганізацыі адукацыі з апорай на сацыякультурныя асаблівасці месца і часу яе ажыццяўлення былі выразна сфармуляваны Ф. А. Дыстэрвегам у прынцыпе культуразгоднасці выхавання. Ідэя пабудовы нацыянальнай школы закладзена ў агульнавядомай канцэпцыі К. Д. Ушынскага аб народнасці выхавання. Распрацоўка гэтага кірунку гісторыі айчыннай і замежнай думкі дазволіла атрымаць шэраг важных высноў.

*Адхілены сумненні адносна неабходнасці ўключэння этнанацыянальнага кампанента ў выхаванне*. Па заключэнні В. М. Сарокі-Расінскага, «зараз ужо не можа быць пытання аб праве нацыянальнага выхавання ў рускай школе, бо нацыянальнае пачуццё ёсць вялікая, не выкараненая і страшэнная сіла. Яе трэба выхоўваць, трэба культываваць» [7, с. 125–126].

Сацыяльна-палітычныя падзеі апошніх дзесяцігоддзяў у Расіі і шматлікіх іншых краінах пацвярджаюць слушнасць гэтых слоў.

*Імкненне супрацьпаставіць нацыянальную адукацыю прыярытэтам і каштоўнасцям сусветнай культуры збядняе іх абедзве, вядзе да нацыянальнай самаізаляцыі, падрывае саму сутнасць паўнацэннай адукацыі.* Роля нацыянальнай адукацыі не раз'ядноўваць, а злучаць народы, арыентавацца на агульную будучыню. На гэтай падставе М. М. Рубінштэйн адзначаў, што «агульначалавечую ідэю мы можам спалучаць і выяўляць у школе на ўважлівым вывучэнні ўсяго роднага, народнага (але не толькі яго аднаго!). Усё вывучэнне павінна быць насычана тэндэнцыяй – духам, каб кожны народ сваім быццём і па-свойму даў як мага больш не толькі сабе і сваім сынам, але і ўсяму чалавецтву і чалавечнасці» [6, с. 393].

*Пры любым узроўні насычанасці адукацыі этнакультурным кампанентам гарманізацыя нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей не павінна адсоўваць на іншы план каштоўнасць пэўнай асобы.* Сучасныя расійскія навукоўцы У. А. і С. П. Белаволавы робяць заключэнне аб неабходнасці этнакультурнай скіраванасці зместу адукацыі і падкрэсліваюць, што «галоўнай мэтай адукацыйнай сістэмы павінна стаць стварэнне гуманістычнай атмасферы, арыентаванай на асобасны падыход у фарміраванні кожнага дзіцяці» [3, с. 44].

*Этнакультурная пабудова адукацыі дапускае арганічнае ўключэнне ў яе змест паняццяў «грамадзянскае» і «дзяржаўнае».* Узяўшы пад апеку развіццё этнічнай культуры, дзяржава мае права разлічваць на адэкватнае стаўленне да сябе носьбітаў гэтай культуры.

У сучаснай рэчаіснасці этнакультурная адукацыя арыентавана на этнічную культуру з апорай на родную мову і культурныя традыцыі, арганічна інтэграваныя ў сусветную культуру. Па сутнасці, **вектар этнакультурнасці адукацыі павінен быць накіраваны не на этнічнае мінулае, а, абапіраючыся на этнічную ідэнтыфікацыю, на ўзняцце выхаванасці да ўзроўню полікультурнасці.** Зараз у Рэспубліцы Беларусь створаны ўсе ўмовы для захавання і развіцця этнічнай культуры, у тым ліку і праз сістэму адукацыі. Але варта адзначыць, што ў рэальнай практыцы далёка не заўсёды і не поўнасцю гэтыя ўмовы выкарыстоўваюцца. А нам ёсць на што абапірацца. За шматвяковую гісторыю беларускім народам назапашаны салідны патэнцыял як матэрыяльнай, так і духоўнай культуры. Гэтыя дасягненні агульнавядомы. Так, напрыклад, наш народ унёс вялікі ўклад у скарбонку сусветнай педагагічнай культуры. Дастаткова адзначыць, што заснавальнік педагогікі як навукі Я. А. Каменскі ў стварэнні «Вялікай дыдактыкі» выкарыстоўваў набыткі найбагацейшага педагагічнага вопыту брацкіх школ Беларусі і Украіны.

**Асаблівасці нацыянальнай, этнічнай культуры, перш за ўсё, адлюстроўвае родная мова**. Яна з'яўляецца асноўным носьбітам духоўнай культуры, праз яе выяўляецца нацыянальная самасвядомасць. У Рэспубліцы Беларусь існуюць дзве дзяржаўныя мовы: беларуская і руская, якімі выпускнік школы павінен у дасканаласці валодаць; акрамя гэтага, свабодна карыстацца хаця б адной з сусветных моў. Выхаванне наогул і этнічнае ў прыватнасці абапіраецца на слова, педагагічныя магчымасці якога агульнавядомы. Родная мова не проста знешняя прыкмета прыналежнасці індывіда да свайго этнасу. Галоўнае адрозненне этнічных моў адна ад адной не столькі ў розных назвах адных і тых жа прадметаў, з'яў, падзей, а ў розным іх бачанні. Дзякуючы мове, народ пакідае ў спадчыну нашчадкам свой светапогляд, свае ідэалы і каштоўнасці, сваё разуменне дабра і зла, сваё бачанне грамадскага ладу. Агульная мова з'яўляецца найважнейшым сродкам фарміравання пачуцця групавой ідэнтычнасці, згуртавання этнічнай супольнасці, у ёй апасродкавана матэрыялізуецца гістарычная памяць. У. У. Протчанка адзначаў, што «трэба браць да ўвагі не толькі багацце і разнастайнасць лексікі, але і структуру, не толькі знешнія формы выражэння сэнсу, але і сам сэнс. Трэба лічыцца з найгалоўнай асаблівасцю: менавіта ў структуры кожнай нацыянальнай мовы ўвасабляюцца сляды думак бацькоў, дзядоў, прадзедаў і прашчураў, іх жыццёвая псіхалогія і філасофія» [5, с. 62].

**Адной з задач па фарміраванні этнічнай культуры з'яўляецца патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення.** Безумоўна, паняцце патрыятызму выходзіць за рамкі нацыянальнага, часта набывае дзяржаўную афарбоўку, але першапачаткова лакалізуецца геаграфічна месцам нараджэння і сацыяльным асяроддзем ранніх этапаў жыцця чалавека. Паняцце «малая радзіма» разумеюць як месца нараджэння, а «вялікая радзіма» ў нашым успрыманні і дзяржава, і грамадства, дзе чалавек пражывае, і культура, у якую ён інтэграваўся.

У перакладзе з грэчаскай мовы тэрмін «патрыятызм» азначае «зямля бацькоў», «радзіма». Сёння сярод складнікаў паняцця «патрыятызм» – і грамадзянская пазіцыя чалавека, і, у той жа час, абарона нацыянальных інтарэсаў. Патрыятызм разглядаецца як неад'емная рыса этнічнасці, натуральная ўласцівасць асобы, якая пачынаецца з любові да маці і захаплення прыгажосцю родных мясцін, развіваецца ў пачуццё гонару за сваю Радзіму і свой народ, вырастае ў рэальныя праявы патрыятычных перакананняў і пачуццяў праз справы і ўчынкі. Правільна арганізаваны працэс патрыятычнага выхавання выключае і сцвярджэнне нацыяналістычных поглядаў, этнацэнтрычныя тэндэнцыі, выпрацоўвае ўяўленне, што такое Айчына. На аснове разумення культурнай непаўторнасці свайго народа ў выхаванца фарміруюцца інтэрнацыяналізм, грамадзянскасць і гуманізм.

**Шматвяковы педагагічны вопыт нашых продкаў пераконвае ў выхаваўчай эфектыўнасці этнакультурных традыцый свайго народа.** Сёння маладое пакаленне мае вострую патрэбу ў сацыяльных арыенцірах, якія абапіраюцца на нацыянальныя каштоўнасці ў рэчышчы агульначалавечай скіраванасці. Пабудова выхаваўчага працэсу на традыцыях этнічнай культуры надае яму гуманістычны характар, спрыяе фарміраванню каштоўнасных арыентацый, маральнай устойлівасці, грамадзянска-патрыятычнай пазіцыі, этнічнай ідэнтычнасці. Этнакультурныя традыцыі абуджаюць у выхаванцаў генетычную памяць, забяспечваюць пераемнасць паміж пакаленнямі, спрыяюць значнаму павышэнню выніковасці выхаваўчага працэсу.

**Народныя звычаі і традыцыі з'яўляюцца найважнейшым педагагічным сродкам, у якім скандэнсаваны народны вопыт і жыццёвая мудрасць па выхаванні падрастаючага пакалення**. Найважнейшай прыкметай традыцый і звычаяў з'яўляецца *пераемнасць*. Яна спрыяе плаўнаму ўваходжанню вопыту папярэдніх пакаленняў у жыццё наступных.

Этнакультурныя традыцыі актыўна ўздзейнічаюць на генетычную памяць індывіда, спрыяюць эфектыўнаму фарміраванню духоўна-маральнай устойлівасці і этнічнай ідэнтычнасці. З глыбокай старажытнасці ў беларусаў зацвердзіліся такія маральныя каштоўнасці, як абшчыннасць, калектывізм, гуманізм, культ працы, культ маці, культ сям'і, талерантнасць, сумленнасць, дабрачыннасць, справядлівасць, патрыятызм, сарамлівасць, дружалюбнасць, міласэрнасць, сціпласць, самакрытычнасць, пачуццё абавязку і інш. Паводле народна-этычных поглядаў усё жыццё павінна будавацца па законах Ісціны, Дабра і Прыгажосці. Імкненне да агульнага дабра праз шчасце кожнага чалавека – такі асноўны пастулат маралі беларусаў. Важна адзначыць, што толькі выхаванец, арыентаваны на народную культуру, які прыняў у аснову ўласнай жыццёвай пазіцыі маральныя каштоўнасці свайго народа, зможа накіраваць сваю дзейнасць на натхнёную творчасць у імя і на карысць гэтага народа.

Адным з істотных недахопаў сучаснай арганізацыі этнакультурна арыентаванай адукацыі з'яўляецца пабудова яе на асобных фрагментах народнай культуры. Часцей за ўсё з усяго пласта народнай культуры выбіраецца адзін або некалькі кампанентаў і на іх аснове робіцца спроба далучэння навучэнцаў да спадчыны продкаў. У выніку ў школьнікаў не можа сфарміравацца цэласнае ўяўленне аб этнічнай культуры; губляецца самае галоўнае – цэласнае фарміраванне асобы.

**Дакладна прадуманае, тэарэтычна, метадычна забяспечанае этнакультурнае выхаванне школьнікаў дазволіць ім зразумець сістэмную будову народнай культуры, якая забяспечвае цэласнасць, устойлівасць і жыццяздольнасць этнічнай супольнасці**. У народнай культуры чалавечае жыццё ад нараджэння да смерці ўключана ў цыкл традыцыйных свят, абрадаў, рытуалаў, якія вызначаюць маральныя арыенціры, задаюць жыццёвы рытм, фарміруюць характар. Таксама чалавек з'яўляецца часткай цэласнага каляндарна-абрадавага комплексу, які вырашае разнастайныя выхаваўчыя задачы, забяспечвае паўнавартасныя зносіны людзей з прадуманым чаргаваннем асобных відаў працы і адпачынку.

Праз увесь фальклор праходзіць ідэя адзінства сучаснасці, мінулага і будучыні, продкаў і нашчадкаў, кроўных сваякоў і параднёных сем'яў – ідэя цэласнасці свету аб'ядноўвае па шматлікіх сэнсавых падыходах самыя розныя з'явы прыроды і грамадства. Сістэма ўзаемаадносін чалавека і прыроды, якая атрымала незвычайную эмацыянальную афарбоўку праз каляндарна-абрадавую культуру, спрыяе таму, што кожны, глыбока адчуўшы сябе ў якасці неаддзельнай часціцы прыроды, адпаведна будзе да яе і ставіцца.

**Распрацоўка сістэмы этнакультурнага выхавання павінна пры выкарыстанні найбольш эфектыўных падыходаў сучаснай педагагічнай тэорыі і практыкі прадугледжваць актыўнае ўключэнне этнакультурных каштоўнасцей у адукацыйны працэс.**

Асобае месца павінна быць адведзена стварэнню і ўкараненню ў вучэбны працэс інтэграваных курсаў з улікам этнакультурнага кампанента, аўтарскіх інавацыйных праграм, якія ўлічваюць дзяржаўную і нацыянальна-рэгіянальную спецыфіку. У гэтым плане добра зарэкамендавалі сябе школьныя курсы «Народазнаўства», «Краязнаўства», «Народныя промыслы» і г. д., асаблівыя вынікі дае праца па комплексных праграмах «Народная культура», «Спадчына» і інш. Этнакультурнае выхаванне прадугледжвае выкарыстанне розных форм вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці (урокі, факультатывы, гуртковыя заняткі, конкурсы, святы, кірмашы, гульні, паходы, экскурсіі, экспедыцыі і інш.). Кожны асобны ўрок, пазакласнае мерапрыемства, кожны педагагічны падыход павінны быць падпарадкаваны цэласнасці культурнага жыцця і арганічна ўваходзіць у сістэму выхаваўчай дзейнасці.

**Важным уяўляецца ўключэнне ў сістэму карысных спраў, якія найбольш эфектыўна выхоўваюць школьнікаў**. Справы могуць быць як непасрэдна звязаныя з этнакультурай, этнатрадыцыямі (напрыклад, збор фальклору), так і знешне не звязаныя з этнакультурай, але пабудаваныя на традыцыйных народных каштоўнасцях. Напрыклад, акцыя «Міласэрнасць», грамадска-карысная праца, прыродаахоўныя мерапрыемствы і г. д. У народзе на эмпірычным узроўні даўно ўжо зроблена выснова (якая, дарэчы, чамусьці і сёння выклікае дыскусіі ў навукоўцаў), што маральнасць фарміруецца на ўзроўні падсвядомасці, эмоцый, звычак, а не на ўзроўні ведаў, якія хоць і складаюць аснову маральнасці, не з'яўляюцца пабуджальнай сілай маральных паводзін. Толькі маральныя перакананні пры ўзаемадзеянні з маральнымі пачуццямі дэтэрмінуюць маральныя ўчынкі.

**Асобае месца ў арганізацыі этнакультурнага выхавання павінна заняць арганізацыя асяроддзя жыццядзейнасці.** Па-першае, гэта школьнае асяроддзе, дзе намаганнямі настаўнікаў і навучэнцаў фарміруецца адпаведная псіхалагічная і маральная атмасфера. Тут усё мае значэнне – ад афармлення інтэр'ера да дзейнасці, якая той або іншай выявай звязана з этнакультурай. Па-другое, гэта асяроддзе сям'і з вызначанымі ўмовамі працы, побыту, традыцыямі і разуменнем важнасці задач этнакультурнага выхавання. Педагагічны патэнцыял этнакультуры сям'і можна актыўна выкарыстоўваць і непасрэдна ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Па-трэцяе, гэта пазашкольнае асяроддзе з яго шматлікімі ўзаемасувязямі і адносінамі. Тут аднолькава важна як нейтралізацыя негатыўных кампанентаў, так і актуалізацыя і ўзбагачэнне этнапедагагічных сродкаў. Уплыў школы на адпаведнае становішча ў кожным асяроддзі далёка не аднолькавы, але ён магчымы і неабходны. Вучэбныя ўстановы павінны працаваць не толькі з самім школьнікам, не толькі з яго сям'ёй, але і з яго блізкім асяроддзем.

Існуюць дзве сур'ёзныя памылкі ў далучэнні школьнікаў да каштоўнасцей этнічнай культуры. Першая заключаецца ў эпізадычнасці, фрагментарнасці гэтай працы. Другая – у стаўленні да этнічнай культуры як архаічнасці, «музейнай рэдкасці»; яе элементамі «ўпрыгожваюцца» асобныя мерапрыемствы і праявы сучаснай культуры. Народнай культуры часцей за ўсё адводзіцца месца на сцэне і ў музеі. Як слушна адзначае У. Д. Шадрыкаў, «дзіця... павінна жыць роднай культурай і ў роднай культуры, а іншыя культуры яно павінна ведаць. Жыць і ведаць – вось у чым глыбінныя адрозненні ў арганізацыі педагагічнага працэсу па стаўленні да родных культур» [8, с. 112]. Уся складанасць працы пры фарміраванні этнічнай культуры школьнікаў заключаецца ў забеспячэнні сістэмы мер па адраджэнні, развіцці нацыянальнай культуры і, што самае важнае, аўтэнтычнасці яе праяўлення.

**Значнае месца ў сістэмнай арганізацыі этнакультурнага выхавання навучэнцаў належыць фальклору, які ў мастацка-сімвалічнай форме ўбірае ў сябе праявы этнічнай свядомасці, што маюць грамадска-значны характар і накіраваны на рэгуляванне адносін чалавека з навакольным светам.** «Функцыяй фальклору з'яўляецца забеспячэнне, захаванне і актуалізацыя этнагістарычных сувязей унутрысістэмнага парадку» [4, с. 62]. Далучэнне дзяцей да вуснай народнай творчасці з ранняга ўзросту ў значнай ступені актывізуе працэс этнічнай ідэнтыфікацыі. Яшчэ больш значным з'яўляецца выкарыстанне фальклорнай спадчыны ў рэальным жыцці, а не ў форме сцэнічных абрадаў. Гэта можа быць і пошукава-пазнавальная дзейнасць, і засваенне народных традыцый, і разнастайная практычная праца з фальклорным матэрыялам.

**Такім чынам, можна зрабіць выснову, што мадэль працэсу этнакультурнага выхавання ўключае ў сябе мэту, задачы, змест, прынцыпы, метады і формы, адэкватныя традыцыйна-побытавай педагагічнай культуры і сучасным педагагічным падыходам.** Інтэграцыйныя працэсы павінны пранізваць усю дзейнасць, далучаючы школьнікаў да культурных народных традыцый. Этнакультурнае выхаванне будуецца, пачынаючы з кагнітыўнага засваення школьнікамі элементаў этнічнай культуры, затым пераходзіць да фарміравання на іх аснове характэрнага стаўлення да навакольнага свету і да самога сабе і, нарэшце, завяршаецца пэўнымі паводзінамі, пэўнай дзейнасцю, якія адпавядаюць каштоўнасным установкам этнасу. Схематычна мадэль этнакультурнага выхавання выглядае наступным чынам:

**Мадэль этнакультурнага выхавання**

Арганізацыя дзейнасці ў рамках этнічнай культуры

↑

Фарміраванне этнакультурных перакананняў

↑

Фарміраванне этнакультурных установак

↑

Засваенне этнакультурных ведаў

↑

Успрыманне этнічнай культуры

Прапанаваная мадэль паказвае ўмоўную паслядоўнасць этапаў этнакультурнага фарміравання асобы. Сам працэс адбываецца комплексна, бесперапынна, без скачкоў і строгай паслядоўнасці ад этапа да этапа. Так, напрыклад, фарміраванне этнакультурных перакананняў можа ісці паралельна з успрыманнем этнакультуры, а падчас этнакультурнай дзейнасці можа папаўняцца багаж этнакультурных ведаў.

**Рэзюме аўтара**



Этнакультурнае выхаванне школьнікаў, якое набыло сёння асаблівую актуальнасць, забяспечвае фарміраванне этнакультурнай самаідэнтыфікацыі як неабходнай асновы духоўна-маральнага станаўлення асобы і ўмовы інтэграцыі ў сусветную культуру. Для гэтага неабходна фарміраваць матывацыю навучэнцаў да самаразвіцця на аснове этнічнай культуры, стымуляваць і актывізаваць працэс этнічнай ідэнтыфікацыі, спрыяць развіццю самабытнасці кожнага школьніка праз арыентацыю на этнакультурныя каштоўнасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Закон Республики Беларусь** «Об общем среднем образовании»; Программа развития общего среднего образования в Республике Беларусь на 2007–2016 годы; образовательный стандарт «Общее среднее образование. Основные нормативы и требования». – Минск: НИО, 2007. – 120 с.
2. **Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития** Республики Беларусь на период до 2020 года (Минск, май 2004) [Электронный ресурс] / Сайт Министерства экономики. – Минск, 2008. – Режим доступа: http://w3.economy.gov.by/ministry/economy.nsf. – Дата доступа: 11.08.2009.
3. **Беловолов, В. А.** Этнокультурная направленность содержания образования / В. А. Беловолов, С. П. Беловолова // Педагогическое образование и наука. – 2002. – № 4. – С. 37–45.
4. **Захарченко, М. В.** Образовательный потенциал традиционной культуры / М. В. Захарченко, Г. В. Лобкова // Вестник Православного Свято-Тихоновского гуманитарного университета. – 2007. – Сер. IV. Педагогика. Психология. – №. 3. – С. 59–69.
5. **Протченко, В. В.** Родное слово – источник развития личности, духовности народа / В. В. Протченко // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – №12. – С.60–65.
6. **Рубинштейн, М. М.** Очерки педагогической психологии / М. М. Рубинштейн. – М., 1920.
7. **Сорока-Росинский, В. Н.** Национальное и героическое в воспитании / В. Н. Сорока-Росинский // Педагогические сочинения / сост. А. Т. Губко. – М.: Педагогика, 1991. – 240 с.
8. **Шадриков, В. Д.** Философия образования и образовательная политика / В. Д. Шадриков. – М.: Просвещение, 1993.